**Пілецкі, В.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце фармацыйнага і цывілізацыйнага прынцыпаў эвалюцыі сусветнага агульнагістарычнага працэсу** / В.А. Пілецкі // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання: Зб. Навук. пр.: У 2 ч. Ч. 2. Актуальныя пытанні ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі. – Мінск: БДПУ, 2003. – 230 с. 65 – 75.

*В. А. Пілецкі*

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ФАРМАЦЫЙНАГА І ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНАГА ПРЫНЦЫПАЎ ЭВАЛЮЦЫІ СУСВЕТНАГА АГУЛЬНАГІСТАРЫЧНАГА ПРАЦЭСУ

Для ўсебаковай характарыстыкі гісторыі любога народа недастаткова простага пераліку фактаў і апісання падзей унутранага і знешняга жыцця грамадства ў храналагічнай паслядоўнасці. Поўнае асэнсаванне гісторыі, акрамя сказанага, павінна ўключаць вызначэнне месца гэтага народа сярод іншых народаў свету, а таксама аналіз тых фактараў, што ўплывалі на гістарычнае аблічча народа і надавалі яго гісторыі пэўныя асаблівасці.

Вызначыць месца асобнага народа ў сістэме гістарычнага развіцця іншых краін можна толькі праз спасціжэнне сутнасці эвалюцыі агульнасусветнага гістарычнага працэсу і асэнсаванне базавых прынцыпаў узаемаадносін у гісторыі. На сённяшні дзень сусветная навука выпрацавала 2 асноўныя прынцыпы (падыходы) разумення сусветнага гістарычнага працэсу — фармацыйны і цывілізацыйны.

Савецкія вучоныя — гісторыкі і філосафы гісторыі — былі прыхільнікамі фармацыйнага тлумачэння сусветна-гістарычнай эвалюцыі. Услед за класікамі марксізму яны лічылі, што гісторыя развіваецца шляхам змены сацыяльна-эканамічных спосабаў вытворчасці, што прыводзіць да змен ва ўсіх іншых сферах жыцця грамадства [1]. Адзін такі асобны спосаб вытворчасці — разам з адпаведнымі яму формамі арганізацыі іншых сфер жыцця грамадства, такіх, як палітыка, культура, рэлігія, тып сям'і і інш.,— гэтыя вучоныя называлі фармацыяй і налічвалі іх 5 за ўсю гісторыю чалавецтва: 1) першабытная; 2) рабаўладальніцкая; 3) феадальная; 4) капіталістычная; 5) сацыялістычная. Планавалася, што пасля сацыялістычнай фармацыі наступіць камуністычны лад, пры якім усе людзі будуць роўныя як матэрыяльна, так і духоўна, а таксама

будуць выдатна падрыхтаваны фізічна і г. д., і ўвогуле наступіць эпоха ўсеагульнага шчасця і радасці.

Такім чынам, у савецкай гістарычнай навуцы панаваў фармацыйны падыход да разумення сусветнага агульнагістарычнага працэсу. Сутнасць фармацыйнага падыходу ў тым, што сусветная эвалюцыя гісторыі разглядалася як непарыўны, аднолькавы для ўсяго чалавецтва працэс змены грамадска-эканамічных фармацый ад прымітыўнай першабытнай да высокаарганізаванай камуністычнай.

Прычынай замены існуючай фармацыі на больш дасканалую служыў, на думку савецкіх філосафаў-марксістаў, «канфлікт паміж прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі».

Паняцце «прадукцыйныя сілы» тлумачылася як сукупнасць прылад працы і іншых сродкаў вытворчасці, а таксама людзей, якія прыводзяць іх у дзеянне. Падкрэслівалася, што ў гістарычным развіцці прадукцыйныя сілы больш дыялектычна рухомыя. Яны аказваюць уплыў на вытворчыя адносіны, якія ў сваю чаргу з'яўляюцца больш кансерватыўнымі.

Вытворчыя адносіны — гэта адносіны людзей у працэсе вытворчасці. Гістарычнымі формамі вытворчых адносін (формамі пабудовы грамадскіх узаемаадносін у працэсе вытворчасці ў гісторыі чалавецтва) былі наступныя: першабытныя, феадальныя, капіталістычныя і сацыялістычныя. У гістарычнай навуцы гэтыя формы разам з іншымі сферамі жыццядзейнасці грамадства называюць сацыяльна-эканамічнымі фармацыямі (першабытная, феадальная, капіталістычная і сацыялістычная).

Што датычыцца тлумачэння ўплыву прадукцыйных сіл на вытворчыя адносіны, то даследчыкі адзначалі, што гісторыя чалавецтва — ад першабытнасці да сённяшніх дзён — уяўляе сабой пастаянную прагрэсіўную эвалюцыю прылад працы, навыкаў арганізацыі вытворчасці, развіцця тэхнікі і інш. У сувязі з гэтым шляхам удасканалення (прагрэсіўнай эвалюцыі), якое з'яўляецца ні чым іншым, як развіццём прадукцыйных сіл, грамадства атрымлівае большую колькасць матэрыяльных даброт. Гэта — праз канфлікт паміж прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі — вядзе да змены сацыяльнага складу самога грамадства, да яго расслаення на класы. З'яўляюцца групы багатых і бедных грамадзян, паміж якімі складваюцца вытворчыя адносіны, пабудаваныя на прынцыпе падпарадкавання. Яны карэнным чынам адрозніваюцца ад вытворчых адносін эпохі першабытнай роўнасці.

Канфлікт паміж прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі адбываўся тады, калі прадукцыйныя сілы, якія ў гісторыі пастаянна апярэджвалі развіццё вытворчых адносін, дасягалі такой кропкі, пасля

якой ужо не маглі развівацца далей пры існуючых адносінах людзей у працэсе вытворчасці. Інтарэс да стваральнай працы ў грамадстве ў такія перыяды звычайна страчваўся. Збядненне часткі насельніцтва дасягала найвышэйшай кропкі. Абвастралася сацыяльная напружанасць у грамадстве. Патрэбны былі карэнныя змены вытворчых адносін, якія б стварылі зацікаўленасць у выніках працы, абудзілі сацыяльную актыўнасць грамадзян, а праз яе прывялі да пашырэння працэсу грамадскай вытворчасці. Так, з'яўленне машынна-фабрычнай вытворчасці ў пачатку перыяду развіцця капіталізму патрабавала функцыяніравання рынку свабодных рабочых рук. Іншымі словамі, развіццё машыннай вытворчасці (развіццё прадукцыйных сіл) патрабавала змен у вытворчых адносінах — вызвалення ад прыгоннай залежнасці шырокіх слаёў сялян, рукі якіх былі патрэбны на фабрыках і заводах, ці развіццё прадукцыйных сіл патрабавала ліквідацыі састарэлых феадальных вытворчых адносін.

Такім чынам, уплыў прадукцыйных сіл на вытворчыя адносіны адбываецца шляхам развіцця прылад працы, павелічэння аб'ёму вытворчасці прадукцыі і сацыяльнай дыферэнцыяцыі грамадства на класы. Вытворчыя адносіны на працягу гісторыі эвалюцыяніруюць (відазмяняюцца) — ад першабытнай роўнасці да рабаўладальніцтва, феадалізму, капіталізму, сацыялізму, а потым ізноў да роўнасці паміж людзьмі. Але ўжо да роўнасці на стадыі камуністычнай фармацыі, якая павінна была быць, на думку распрацоўшчыкаў фармацыйнага падыходу, пазбаўленай, як і першабытны лад, падзелу на класы.

Важна падкрэсліць, што змены ў сацыяльна-эканамічным статусе грамадства, калі глядзець з пазіцый фармацыйнага падыходу, адбыліся не толькі 1 раз пры пераходзе ад першабытнасці да класавай фармацыі (ці пераходзе ад капіталізму да сацыялізму). Яны адбываюцца пастаянна, нават на сучасным этапе развіцця гісторыі. Так, у нашай недалёкай савецкай гісторыі да канца 80-х гг. XX ст. жыццё людзей пастулова аказалася застылым. Інтарэс да стваральнай працы быў страчаны. Зарабіць больш грошай, калі ты лепш працуеш, было немагчыма. Патраціць заробленае так, як табе хочацца, было таксама немагчыма. Атрыманне кватэры, пакупка машыны, дачы — усё гэта знаходзілася пад жорсткім кантролем партыйна-дзяржаўнага апарату. Усе савецкія людзі павінны былі быць аднолькавымі. КПСС таталітарна кантралявала ўсе сферы жыцця грамадства і кожнага асобнага чалавека [2].

Як толькі адбыўся развал СССР і партыйныя структуры аказаліся не ў сілах больш кантраляваць ўсе сферы жыцця грамадства, адразу ж усталяваўся зусім іншы выгляд жыцця людзей. Тыя, хто імкнуўся пра-

цаваць, думаць пра магчымыя формы дасягнення лепшай будучыні, пачалі багацець; другія ж пачалі хутка біднець. У той жа час з'явілася новая ідэалогія (ці, дакладней, 2 ідэалогіі: з аднаго боку, філасофія новых беларусаў, а з другога — тых, хто не змог знайсці сілы ўтрымацца ў новых рэаліях жыцця). Тады ж пачалася люмпенізацыя часткі грамадства, што выявілася ў крайнім збядненні з прыкметамі страты цікавасці да жыцця.

Інакш кажучы, у беларускім грамадстве на мяжы 80—90-х гг. XX ст. адбылася змена сацыяльна-эканамічнага ўкладу жыцця грамадства, змена сацыяльна-эканамічнай фармацыі, для якой філосафы пакуль яшчэ не знайшлі дакладнай назвы.

На сённяшні дзень, нягледзячы на блізкасць фармацыйнай тэорыі да жыццёвых рэалій, растлумачыць развіццё гісторыі краіны толькі з дапамогай фармацыйнага падыходу аказалася немагчымым. Крызіс, распад СССР і пачатак пераходу краін усходнееўрапейскага рэгіёна на рэйкі рынкавай эканомікі (што з'яўляецца паказчыкам капіталістычнай фармацыі) паставілі навукоўцаў перад пытаннем лагічнасці асноўнага тэзіса фармацыйнага падыходу — тэзіса аб заканамернасці змены фармацый. Пасля сацыялізму не наступіў камунізм.

У сучасных умовах, на думку беларускіх навукоўцаў, асэнсаваць сучаснасць, а таксама найбольш поўна і аб'ектыўна раскрыць сусветна-гістарычны працэс можна толькі шляхам адначасовага выкарыстання фармацыйнага і цывілізацыйнага (культуралагічнага) падыходаў.

У тлумачальнай запісцы Праграмы па гісторыі для базавых агульнаадукацыйных школ, апублікаванай у «Настаўніцкай газеце» за 3 ліпеня 1993 г., адзначана, што «спалучэнне цывілізацыйнага і фармацыйнага прынцыпаў... (ёсць.— В. П.) аптымальны варыянт пабудовы курсаў гісторыі» [3].

Распрацоўшчыкамі цывілізацыйнага прынцыпу лічацца:

1) нямецкі філосаф, гісторык О. Шпенглер (1880—1936). Яго асноўная праца па філасофіі гісторыі — 2-томны «Закат Еўропы» (1918—1922) [4, с. 550];
2) брытанскі гісторык, дыпламат, сацыёлаг А. Дж. Тойнбі (1889—1975). Яго асноўная праца па філасофіі гісторыі — 12-томнае «Даследаванне гісторыі» («Спасціжэнне гісторыі») (1934—1961) [4, с. 484].

Сутнасць цывілізацыйнага прынцыпу ў тым, што гісторыя сусвету развіваецца ў маштабах усяго зямнога шара не аднолькава, з абавязковай зменай сацыяльна-эканамічных фармацый, як гэта падкрэслівалі гісторыкі-марксісты, а шляхам адначасовага суіснавання і эвалюцыі асобных культур (цывілізацый).

«Замест бязрадаснай карціны лінеарнай сусветнай гісторыі... я бачу,— пісаў О. Шпенглер,— сапраўдны спектакль мноства магутных культур... якія чаканяць... уласную форму і маюць кожная сваю ўласную ідэю, уласныя страсці, уласнае жыццё, волю, адчуванне, уласную смерць. <...> У кожнай культуры свае новыя магчымасці выяўлення, якія з'яўляюцца, спеюць, вянуць і ніколі не паўтараюцца... кожная ў сабе самой замкнутая...» [5, с. 151].

Такіх культур, што прайшлі «поўны курс развіцця» або праходзяць яго на сучасным этапе, О. Шпенглер налічваў 7: егіпецкая, індыйская, вавілонская, кітайская, «апалонаўская» (грэка-рымская), «фаўстаўская» (заходнееўрапейская) і «магічная» (візантыйска-арабская).

На думку аўтараў Праграмы па гісторыі для базавых агульнаадукацыйных школ, на сённяшні дзень налічваецца 8 асноўных цывілізацый: 1) заходняя; 2) усходнееўрапейская (абшар былога СССР і краін сацлагера); 3) мусульманская; 4) індыйская; 5) кітайская; 6) японская; 7) лацінаамерыканская; 8) афрыканская [3].

Цяжка не пагадзіцца з меркаваннем, што сусветна-гістарычны працэс не аднолькавы ў розных сваіх часава-тэрытарыяльных праяўленнях. Сапраўды, няўжо можна параўнаць жыццё (ды і ўвогуле ўсю гісторыю развіцця) еўрапейцаў і жыхароў афрыканскага кантынента, хоць першыя людзі ў Афрыцы з'явіліся амаль на 1,5 млн год раней, чым у Еўропе.

Адрозненняў паміж асобнымі рэгіёнамі жыцця на планеце шмат. Прадстаўнікі адных рэгіёнаў лятаюць на касмічных караблях, ведаюць камп'ютэр, інтэрнэт і іншыя суперсучасныя тэхналогіі, прадстаўнікі ж іншых жывуць на ўзроўні каменнага веку. Усё гэта прыводзіць да думкі аб нейкіх рэгіянальных агульнасцях, асобных культурах, цывілізацыях і інш. Пацвярджэннем сказанаму могуць служыць, напрыклад, факты наяўнасці абарыгенаў Аўстраліі, што жылі ажно да XIX ст. ва ўмовах, блізкіх да першабытнага ладу, ці папуасаў унутраных раёнаў Новай Гвінеі, якія ў 40-я гг. XX ст. з'яўляліся неалітычнымі земляробамі і зусім не былі знаёмы з металамі. Уражваюць таксама звесткі аб жыхарах Вогненнай Зямлі, якія ў сярэдзіне XX ст. вялі паляўніча-рыбалавецкі спосаб жыцця, нават не ведаючы земляробства [6, с. 412].

Існаванне культур, па О. Шпенглеру, як і ўвогуле развіццё гісторыі, не ёсць сведчанне адзінства гістарычнага працэсу ва ўсім свеце, а ёсць усяго толькі праяўленне адзінства магчымых форм развіцця. Інакш кажучы, вучоны не прызнае адзінства гістарычнага працэсу ў свеце і аднолькавых заканамернасцей яго развіцця. Ён лічыць, што законы развіцця існуюць толькі ў межах адной пэўнай культуры.

Кожная культура, на думку аўтараў гэтай канцэпцыі, развіваецца па схеме «юнацтва — росквіт — заняпад» і грунтуецца на сувязі з

прыродна-геаграфічнымі ўмовамі, якія адыгрываюць «вырашальную ролю ў стварэнні непаўторнага аблічча кожнай цывілізацыі». Можна нават правесці, на думку А. Дж. Тойнбі, «параўнальнае даследаванне індывідуальнай гісторыі» кожнай вядомай гісторыкам цывілізацыі. «Калі мы намалюем схему асноўных фаз цывілізацый — нараджэнне, рост, надлом і падзенне,— мы зможам параўнаць іх вопыт ад фазы да фазы... супаставіць агульныя аспекты іх гісторый (маецца на ўвазе гісторый цывілізацый.— В. П.) як нейкія спецыфічныя рысы, адмежаваўшы іх ад адзінкавых моманатаў, што ўяўляюць сабой індывідуальныя асаблівасці,— адзначаў даследчык.— Такім чынам мы зможам распрацаваць марфалогію (сістэму, асобны навуковы падыход да разумення відаў цывілізацый.— В. П.) відаў грамадства, называемых цывілізацыямі» [6, с. 102].

У розных цывілізацыях (культурах) адзінства форм праяўлення жыцця (форм грамадскай самаарганізацыі), як правіла, набывае розную пазіцыйную расстаноўку і розны ўнутраны змест (асобныя формы ў некаторых цывілізацыях увогуле могуць адсутнічаць). Праілюструем гэта:

1) у гісторыі краін усходнееўрапейскага рэгіёна (у тым ліку Беларусі) адсутнічала, напрыклад, рабаўладальніцтва як асобная фармацыя, а ў Грэцыі і Рыме яно было класічным [7];
2) чалавечая гісторыя на еўрапейскім кантыненце пачалася прыблізна каля 600 тыс. год назад (шэльска-ашэльскі перыяд), а ў Афрыцы — каля 1,5—2 млн год назад і г. д.

Цывілізацыя — гэта ўстойлівая культурна-гістарычная агульнасць людзей з уласцівымі ёй духоўнымі, маральнымі каштоўнасцямі і традыцыямі, падобнымі ўмовамі матэрыяльнай вытворчасці, адносным адзінствам сацыяльна-палітычнага развіцця, пэўнымі этнічнымі рысамі і геаграфічнымі межамі. Сутнасць кожнай цывілізацыі праяўляецца найперш у яе духоўных асновах і каштоўнасцях. Найбольш выразна тую ці іншую цывілізацыю адлюстроўваюць рэлігійныя сістэмы і погляды (усяго выдзяляюць больш за 30 цывілізацый, якія існавалі ў мінулым і існуюць зараз) [3].

Такім чынам, зыходзячы з вышэйсказанага, можна зрабіць выснову, што сусвет развіваецца ў межах асобных цывілізацый як суб'ектаў гісторыі, якім уласцівы ўласныя духоўныя, маральныя, рэлігійныя каштоўнасці, агульнасць спосабу вытворчасці, тэрыторыі і інш. У межах адной цывілізацыі гісторыя развіваецца, як правіла, фармацыйна — ад першабытнасці да капіталізму і сацыялізму.

Асаблівасцей гісторыі асобных народаў у межах адной цывілізацыі няшмат (этнаграфічныя; розныя асобныя падзеі і інш.), прычым яны, як правіла, маюць тэндэнцыю да нівеліроўкі.

Узаемаадносіны паміж цывілізацыямі ў гісторыі, як правіла, складваюцца няпроста. На працягу ўсяго часу іх існавання паміж імі адбываюцца сутыкненні, якія маюць разнапланавы характар і якія ажыццяўляюцца эканамічнымі і палітычнымі метадамі, супрацьстаяннем культур, ідэалогій і інш. У свеце ідзе пастаянная барацьба цывілізацый. Не заўважыць гэта нельга, асабліва калі звярнуць увагу на палітычны аспект сусветнай гісторыі. Чым, напрыклад, калі не міжцывілізацыйнай барацьбой, растлумачыць пастаяннае палітычнае, культурнае, эканамічнае і іншае, нават ваеннае, супрацьстаянне заходнееўрапейскага (уключаючы ЗША) і ўсходнееўрапейскага (расійскага) рэгіёнаў, якое выліваецца то ў супрацьстаянне грамадска-ідэалагічных канцэпцый (славянафілы — заходнікі), то ў культурныя адлюстраванні, а то і ў адкрытае супрацьстаянне накшталт халоднай вайны, не гаворачы ўжо пра ваенна-палітычнае супрацьстаянне падчас сусветных і лакальных войнаў.

Як вядома, на працягу ўсёй гісторыі, пачынаючы з Сярэднявечча, ідзе барацьба паміж турэцка-арабска-мусульманскім і еўрапейска-хрысціянскім нацыянальна-рэлігійна-тэрытарыяльнымі рэгіёнамі. Сёння, напрыклад, яна нагадвае аб сабе канфліктамі з міжэтнічнай падаплёкай у Югаславіі і Чэчэнскай рэспубліцы Расійскай Федэрацыі. Дарэчы, як адзначыў В. Ф. Шалькевіч, пагрозу для хрысціянскага свету з паўднёвага ўсходу заўважыў яшчэ наш выдатны асветнік М. Гусоўскі (1470-я гг.— пасля 1533 г.), калі працаваў над сваім неўміручым творам «Песня пра зубра» [8].

На аспекце сутыкненняў і барацьбы паміж цывілізацыямі даволі падрабязна спыняліся распрацоўшчыкі цывілізацыйнага падыходу. «У лёсах асобных, змяняючых адну адну, вырастаючых адна каля другой, дакранаючыхся, адціскаючых і падаўляючых адна адну культур — вычэрпваецца ўвесь змест чалавечай гісторыі»,— адзначаў О. Шпенглер [5, с. 262].

Ёсць «некалькі прыкладаў... сутыкненняў паміж рознымі цывілі-зацыямі... У выніку заваёў... грэка-рымская цывілізацыя распаўсюдзілася на большай частцы Старога Свету». Быў таксама і «контруплыў... іншых цывілізацый на грэка-рымскі свет. Гэта контрнаступленне часткова ажыццяўлялася тым жа спосабам, што і першапачатковае наступленне грэка-рымскага свету, ці сілай зброі... (напрыклад.— В. П.) сенсацыйныя перамогі арабскіх мусульман, якія ў III ст. н. э. вызвалілі Бліжні Усход ад грэка-рымскага падпарадкавання... Але акрамя гэтага, было і іншае контрнаступленне, непрымусовае, духоўнае, у час якога заваёўваліся не крэпасці і правінцыі, а розумы і сэрцы»,— пісаў А. Дж. Тойнбі [6, с. 131].

Сапраўды, нельга не пагадзіцца з тым, што кожная цывілізацыя знаходзіцца ў пастаяннай разнапланавай канкурэнцыі з суседнімі цывілізацыямі і імкнецца пашырыць свой уплыў на іх.

«Нападаючая культура,— пісаў А. Дж. Тойнбі,— раскладаецца на састаўныя часткі... (Яе кампанентамі з'яўляюцца.— В. П.) эканамічны, палітычны і ўласна-культурны элементы. Калі адна культура ўрываецца ў другую, пранікаючая сіла кожнага з элементаў прама супрацьлеглая яго сацыяльнай каштоўнасці. Так эканамічны элемент успрымаецца чужой культурай з найбольшай прыхільнасцю, за ім рухаецца палітыка, і на апошнім месцы аказваецца культурны элемент... канчаецца ўсё сацыяльнай катастрофай. Вайна і гандаль — вось два галоўныя каналы ўзаемаадносін... прычым пануючая роля належыць вайне» [9].

Дарэчы, тэрытарыяльна цывілізацыі сутыкаюцца з ускраіннымі часткамі суседніх цывілізацый. У дадзеным выпадку нельга не сказаць аб спецыфічным становішчы народаў, што пражываюць на ўскраінах цывілізацый.

Уся гісторыя народаў, што размешчаны на ўскраіне цывілізацыі, як правіла, нясе на сабе адбітак міжцывілізацыйнага супрацьстаяння. Гэтыя народы засвойваюць, па А. Дж. Тойнбі, эканамічны, культурны і іншыя аспекты розных цывілізацый і, канешне ж, маюць у сваім грамадстве прыхільнікаў як адной, так і другой цывілізацыі.

Бывае, што народы, пражываючыя на ўскраінах цывілізацый, часова пераходзяць з адной цывілізацыі ў другую (у выніку заваявання або натуральна-гістарычным, эвалюцыйным шляхам).

Важна таксама тое, што асноўны кампанент дэфініцыі цывілізацыі як гістарычнага паняцця — ідэалагічна-рэлігійны — часта даволі глыбока пранікае ў менталітэт і грамадскае асяроддзе народаў, пражываючых на ўскраінах вялікіх цывілізацый. Пры гэтым ён стварае пастаянна дзеючую апазіцыю існуючай цывілізацыі праз прыхільнасць вернікаў да іншых ідэалаў.

Трэба адзначыць, ужываючы фізічныя тэрміны, што паміж цывілізацыямі адбываецца пастаяннае ўзаемапранікненне культурнага, рэлігійна-ідэалагічнага, гандлёва-эканамічнага, ваенна-палітычнага і іншых патэнцыялаў. У гэтым узаемапранікненні (барацьбе) часта здараецца так, што асобныя часткі цывілізацый (асобныя тэрыторыі або нават цэлыя народы) пераходзяць з адной цывілізацыі ў другую і наадварот. Пераходзяць яны на гістарычна працяглыя перыяды, за якія ў іх вырастае адно ці некалькі пакаленняў грамадзян, што лічаць культуру і рэлігію новай цывілізацыі роднай.

Пазней можа здарыцца так, што такому народу будзе наканавана зноў перайсці ў былую цывілізацыю на гістарычна працяглы тэрмін. Гэта значыць, што менталітэт, культура, рэлігія, набыткі эканамічнага, палітычнага і іншага кшталту, якія былі выпрацаваны пакаленнямі, што пражывалі ў межах супернічаючай цывілізацыі, павінны будуць па-жывому вырывацца са свядомасці народа, з яго гісторыі і культуры.

Менавіта такім народам, які пражываў на ўскраіне цывілізацыі і пераходзіў на працягу гісторыі з адной цывілізацыйнай супольнасці ў другую, з'яўляецца беларускі народ.

У сярэдневяковай гісторыі, напрыклад, Беларусь «была ў сацыяльна-эканамічных адносінах перыферыяй тагачаснай Еўропы» [10]. У іншыя перыяды сваёй гісторыі, часцей за ўсё пад уплывам міжцывілізацыйнай канфрантацыі «усход — захад», яна пераходзіла з адной цывілізацыі ў другую.

Калі храналагічна паглядзець на ўсю гісторыю беларускага народа, то нельга не заўважыць наступных момантаў.

Па-першае, у полацка-тураўскі перыяд (IX—XIII стст.) землі Беларусі знаходзіліся ў межах усходнееўрапейска-візантыйскай цывілізацыі. На Беларусі існавалі асобныя дзяржаўныя ўтварэнні, што былі ў эпізадычна-паўвасальнай залежнасці ад Кіеўскай Русі [11]. Тут, як і ў Кіеўскай Русі, развіваліся культурна-рэлігійныя, палітычныя і эканамічныя працэсы, характэрныя для ўсходнееўрапейска-візантыйскага грамадска-гістарычнага асяроддзя.

Па-другое, перыяд развіцця Беларусі ў межах ВКЛ і Рэчы Паспалітай (1246—1795) — гэта час заходнееўрапейскай культуралагічнай дамінанты. У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай Беларусь была вырвана з заходнееўрапейскай культуры і рэлігіі і ўключана ў склад Расіі.

Па-трэцяе, у сучасны перыяд, калі СССР распаўся, найбольш важным для Беларусі з'яўляецца пытанне «З кім быць Беларусі — з Захадам або Расіяй?». Адказ на яго шукаюць як палітычна-ўладныя, так і апазіцыйныя колы.

Падсумоўваючы сказанае, можна адзначыць, што беларускі народ мае ўнікальную гісторыю. Не адзін народ у свеце не зведаў у поўным аб'ёме ўсяго таго, што выпала на гістарычную долю нашых продкаў. Унікальнасць гісторыі вызначаецца ў першую чаргу геапалітычным становішчам.

Геаграфічнае месцаразмяшчэнне Беларусі — гэта тэрыторыя ўзаемапранікнення заходняй і ўсходнееўрапейскай цывілізацый. Гэта рэгіён, на які на працягу ўсёй гісторыі аказваўся моцны ўплыў з двух бакоў — з захаду і ўсходу.

Зробім некалькі высноў.

1. Сусветная гісторыя развіваецца не аднолькава фармацыйна, як лічылі савецкія гісторыкі, а ў межах асобных цывілізацый (культур). Тым не менш апошнія ў сваёй гістарычнай эвалюцыі праходзілі асобныя сацыяльна-эканамічныя фармацыі.
2. Цывілізацыі (як і асобныя народы, дзяржавы, краіны) — гэта суб'екты гісторыі (толькі больш буйныя і своеасаблівыя). Паміж сабой яны знаходзяцца ў пастаяннай канкурэнцыі, якая мае месца ў культурнай, эканамічнай, ваенна-палітычнай і іншых сферах.
3. Народы, якія пражываюць на ўскраінах асобных цывілізацый, часта ў выніку міжцывілізацыйнай барацьбы пераходзяць з адной цывілізацыі ў другую, прымаючы культурныя, эканамічныя, палітычныя і іншыя напрацоўкі супрацьлеглых цывілізацый. Яны адчуваюць уплыў як з аднаго, так і з другога боку.
4. Геаграфічнае месцаразмяшчэнне Беларусі міжцывілізацыйнае. Яна знаходзіцца паміж заходняй і ўсходнееўрапейскай цывілізацыямі. Барацьба дзвюх усемагутных цывілізацыйных сістэм, якая на працягу стагоддзяў вельмі часта адбывалася на тэрыторыі Беларусі, заўсёды ўплывала на гісторыю беларускага народа. Яна аслабляла парасткі ўласнай беларускай дзяржаўнасці, вынішчала людскія рэсурсы і эканамічны патэнцыял беларускага народа, адмоўна ўплывала на яго культуру, беларускую мову (якая мела дзяржаўны статус на працягу гістарычна працяглага перыяду ў час развіцця ВКЛ) і г. д.

Усё пералічанае зніжала ўзровень нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, не спрыяла самаідэнтыфікацыі насельніцтва на беларускай этнічнай аснове. Інакш кажучы, гістарычны лёс Беларусі з-за гэтага меў своеасаблівыя рысы. Аб іх мы раскажам у нашых наступных публікацыях.

*Літаратура*

1. Маркс К., Энгельс Ф. Сочинения: В 39 т. 2-е изд. М., 1961. Т. 6. С. 442.
2. Касцюк М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мн., 2000; Сідарцоў У., Фамін В. Усебаковы падыход — шлях да праўды // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 4. С. 88—90.
3. Настаўніцкая газета. 1993. 3 ліп. С. 2.
4. Философский словарь / Под ред. И. Т. Фролова. 5-е изд. М., 1986.
5. Шпенглер О. Закат Европы: Очерки морфологии мировой истории / Пер. с нем., вступ. ст. и примеч. К. А. Свасьяна. М., 1993. Т. 1. Гештальт и действительность.
6. Тойнби А. Дж. Цивилизация перед судом истории: Сб. / Пер. с англ. И. Е. Киселевой, М. Ф. Носовой. М.; СПб., 1995.
7. Горемыкина В. И. Возникновение и развитие первой антагонистической формации в средневековой Европе (Опыт историко-теоретического исследования на материале варварских королевств Западной Европы и Древней Руси). Мн., 1982. С. 78—99; Горемыкина В. И. О генезисе феодализма в Древней Руси // Вопросы истории. 1987. № 2.

8. Шалькевіч В. Ф. Палітычныя погляды М. Гусоўскага // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 4. С. 16—21.
9. Тойнби А. Дж. Постижение истории: Пер. с англ. / Сост. А. П. Огурцов; Вступ. ст. В. И. Уколовой; Заключ. ст. Е. Б. Рашковского. М., 1991. С. 543.
10. Конан У. М. Адраджэнне // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1993. Т. 1. С. 59.
11. Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання: Зб. навук. пр.: У 2 ч. Мн., 2002. Ч. 1. Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі. С. 28.

# АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ:
## СУЧАСНЫЯ ПОГЛЯДЫ І МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

*Частка 2*



**Актуальныя пытанні ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі**